# *І ЗНОЎ У ШКОЛУ*



**18 верасня 2025 года ў створанай Гродзенскім абласным аддзяленнем СПБ Грамадскай літаратурнай школе пачаўся новы навучальны год. Пачаўся па-новаму. Але досыць ярка, крэатыўна і змястоўна – з семінарскага занятку (тэма «Сацыялізацыя творчасці. Крок 1»), якім плануецца надаць цыклічны характар.**

Па сутнасці атрымалася сустрэча ў коле добрых, верных сяброў, аднадумцаў, калег, у суполцы, якую можна назваць саюзам. Мы абмеркавалі шляхі рэалізацыі нашых творчых здольнасцяў, навыкаў, набытых у тым ліку і на занятках літшколы; пагаварылі пра публікацыі і іншыя важныя творчыя праекты. Ініцыятар грамадска-адукацыйнага праекта ГрАА СПБ Дзмітрый Радзівончык пазнаёміў прысутных з некаторымі перыядычнымі літаратурнымі выданнямі і заклікаў аўдыторыю да больш актыўнага супрацоўніцтва з імі, а таксама распавёў аб працы абласной пісьменніцкай арганізацыі з маладымі аўтарамі, нагадаў аб тым, што Гродзенская грамадская літаратурная школа мае не толькі калектыўныя формы працы, але праводзіць і індывідуальныя літкансультацыі. Старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Людміла Антонаўна Кебіч пералічыла і падрабязна ахарактарызавала актуальныя напрамкі дзейнасці арганізацыі, засяродзіўшы ўвагу слухачоў на адкрытых формах працы, закранула некаторыя праблемныя аспекты сучаснага літаратурнага працэсу.





Адбыліся чытанні аўтарскіх твораў, а таксама культуралагічныя, філалагічныя дыскусіі, без якіх не абыходзіцца ні адна сустрэча ў нашай грамадскай літаратурнай школе. Па шматлікіх просьбах нашых наведвальнікаў семінарскі занятак прайшоў у форме сяброўскага чаявання. Значным плюсам мерапрыемства стаў удзел у ім зацікаўленай моладзі, а мінусам – амаль поўная

адсутнасць калег па СПБ.

Чароўная па сваёй энергетыцы атмасфера нефармальных сяброўскіх зносін натхняе і нараджае ў душах людзей творчы настрой. Такая выснова напрошваецца па сканчэнні нашага семінарскага занятку. А магчыма, мы проста засумавалі за лета па нашай кампаніі і па нашай любімай справе – пісьменніцтву... Выказваем падзяку ўсім, хто на працягу некалькіх гадоў падтрымлівае нашу літшколу і тым, хто далучыўся да нас упершыню. Дата і тэма наступнай сустрэчы будуць паведамлены дадаткова.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** з семінарскага занятку (тэма «Сацыялізацыя творчасці. Крок 1**»)** у створанай Гродзенскім абласным аддзяленнем СПБ Грамадскай літаратурнай школе пачаўся новы навучальны год. Офіс ГрАА СПБ, 18 верасня 2025 года.



**Моладзь на занятках – гэта вельмі важна і радасна**




**Таксама радасна (і вельмі адказна) бачыць на занятках літшколы нашага кіраўніка**





**Дзмітрый Радзівончык (СПБ-Гродна)**



**Галіна Іванаўна Садоўская прачытала свае вершы**



**Упершыню на занятках Максім Краўцэвіч (ГрДУ імя Янкі Купалы, юрыдычны факультэт)**



**Знаёмцеся: маладая паэтэса Маргарыта Воўк (філфак ГрДУ імя Янкі Купалы, ІІ курс. Дзякуем, шаноўная Аліна Эдмундаўна!)**




**Людміла Антонаўна прэзентавала калектыўны зборнік, выдадзены да 130-годдзя са дня нараджэння Сяргея Есеніна**






**Паэтэса Алена Шаламіцкая падзялілася шляхамі сацыялізацыі ўласнай творчасці і прачытала вершы на беларускай мове**



**Паэт, публіцыст Станіслаў Вішнеўскі (Гродзенскае гарадское літаб’яднанне «Надежда»)**






**Вольга Дзіканава**




**Ірына Салата. Кнігавыданне: вынікі ёсць…**



[Анатоль Апанасевіч](#) (СПБ-Гродна)






**Віншуем з публікацыяй Паліну Борыс (літаб’яднанне «Альшанскі перазвон», СШ № 39 імя І. Д. Лебедзева)**





Давід Куратнік (6 гадоў) – самы юны паэт
за ўсю гісторыю нашай літшколы






**Заўсёды ў добрым настроі паэтэса Ірына Полудзень**




**Паэтэса, празаік Кацярына Калік выступіла з празаічнымі мініяцюрамі**




**Усе разам (на жаль, выступілі не ўсе)**
*Фота* **Анатоля Апанасевіча**